**ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2021 г.

## <u>Мерапрыемствы ў рамках тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі</u>

**2 красавіка**

Шмат эмоцый у юных чытачоў выклікалі мерапрыемствы у рамках свята кнігі «Паэзія дабрыні»: «Прысвячэнне ў чытачы першакласнікаў», бібліяквэст «По казачным сцяжынкам» і іншыя. Дзеці здзейснілі падарожжа ў свет кнігі, чыталі вершы, паказалі добрыя веды казак, паўдзельнічалі у літаратурных конкурсах, віктарынах, гульнях, паадгадвалі загадкі. Арганізавана кніжная выстава «Советы мудрой совы».

Тэвельская ПБ, 38 чал.

**5 красавіка**

На літаратурным свяце «Кніжная краіна сяброў» казачныя героі разам з удзельнікамі даведаліся, калі і як пачалі праводзіць «Книжкину неделю», пазнаёміліся з гісторыяй стварэння кнігі, успомнілі правілы паводзін у бібліятэцы. Дзеці чыталі вершы, адгадвалі загадкі ў літаратурнай гульні «Мы – герои сказок, отгадайте без подсказок», адказвалі на пытанні віктарын па вершах і казках у гульні-пошуку «Ключи от сказок и стихов». Дыпломамі і прызамі ўзнагароджаны лепшыя чытачы, актыўныя ўдзельнікі чытацкіх віктарын, пераможцы конкурсаў. Падрыхтаваны кніжныя выставы «Ключи от сказок и стихов», «Завітала ў госці казка».

Батчынская ПБ, 60 чал.

**5 красавіка**

Бібліятэка запрасіла навучэнцаў на квэст-гульню «Весна-красна идёт!». У гульні ўдзельнічалі дзве каманды, якія павінны былі сабраць «сонечныя прамені» і вярнуць сілу сонцу. Для гэтага запатрабавалася прайсці маршрут з шасці станцый, скарыстаючы свае веды, уменні, творчыя здольнасці і спрыт.

Залеская ПБ, 25 чал.

**5 красавіка**

На хіт-парадзе найлепшых кніг «Книжная радуга» дзеці адказвалі на пытанні віктарыны «Любимые герои на книжных страницах», знаёміліся з новымі кнігамі і дзяляліся ўражаннямі пра прачытаныя, глядзелі мультфільмы, мультмузкліпы, спявалі песні разам з героямі і караоке, чыталі ўслых урыўкі з казак. Пад канец праграмы дзеці выбралі кнігі дахаты і атрымалі закладкі з раскладам работы бібліятэкі.

Арэхаўская ПБ, 17 чал.

## Мерапрыемствы да 35-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**17 красавіка**

Гасцямі інфармацыйна-патрыятычнай гадзіны «Под чернобыльским пеплом ...» сталі навучэнцы дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячы сад-сярэдняя школа №4 г. Кобрына». Супрацоўнікі бібліятэкі нагадалі дзецям хроніку падзей страшнай тэхнагеннай катастрофы XX стагоддзя, яе ўплыве на экалагічную і дэмаграфічную сітуацыю ў свеце, пра гераізм персаналу станцыі, пажарных, ліквідатараў аварыі. Завяршылася мерапрыемства аглядам кніг пра Чарнобыльскую катастрофу, прадстаўленай на выставе «Чернобыль – горькая память и вечная боль…».

ЦБ, 23 чал.

**24 красавіка**

Тэматычная інфармацыйная гадзіна «На земле, опаленной Чернобылем» адбылася для навучэнцаў старэйшых класаў гімназіі г. Кобрына.

Чаму адбыўся выбух на энергаблоку № 4 Чарнобыльскай АЭС? Якая хроніка падзей? Якія меры для ліквідацыі наступстваў аварыі былі прыняты ў першыя хвіліны, гадзіны і наступны час? Хто яны - ліквідатары? Супрацоўнікі бібліятэкі правялі агляд кніг пра Чарнобыль «Чернобыльская трагедия: как это было». Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Двадцать секунд, которые потрясли мир».

ЦБ, 26 чал.

**26 красавіка**

Тэматычная праграма «Чернобыль: не гаснет памяти свеча!» літаратурна-паэтычнай групы «Агеньчык» адбылася ў бібліятэцы. Урыўкі з літаратурных твораў І. Шамякіна, З. Аляксеевіч, Ю. Вазнясенскай і інш. у выкананні ўдзельнікаў ЛПГ напомнілі гледачам храналогію падзей 1986 г. і якой трагедыяй павярнулася катастрофа ў сем'ях ліквідатараў чарнобыльскай аварыі. Падрыхтаваны відэапрэзентацыя і выстава «Чернобыль: вечная память и вечная боль!»

Залеская ПБ, 95 чал.

**28 красавіка**

На вечар памяці «Бяда... Чарнобыль... Чалавек...» запрошаны вучні Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Рабятам распавялі аб розных версіях прычыны аварыі на ЧАЭС. Прысутныя ўбачылі фотаздымкі з месца падзей, пачулі пра мужнасць пажарных, даведаліся пра эканамічныя шкоды, нанесеныя Чарнобыльскай катастрофай.

ЦБ, 31 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 красавіка**

Гасцямі літаратурна-музычнай кампазіцыі «Дружба народаў - дружба літаратур», прысвечанай Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, сталі

навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Вядучыя рассказалі аб гістарычных каранях Дня яднання, пазнаёмілі з творчасцю паэтаў Беларусі і Расіі, гісторыяй літаратурнага супрацоўніцтва двух народаў. Добрым дадаткам літаратурнай тэмы стаў відэаролік «Дзве Русі - дзве сястры».

ЦБ, 33 чал.

**5 красавіка**

Творчая анлайн-сустрэча «Паэзія нас звязала», прымеркаваная да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі, пры дапамозе інтэрнэт-тэхналогій з'яднала кобрынскіх і брянскіх паэтаў. Пачалося мерапрыемства са знаёмства тых, хто арганізаваў сеанс сувязі ў Skype, – Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі і Брянскай абласной навуковай універсальнай бібліятэкі ім. Ф. І. Цютчава. Літаратурнай творчасцю з калегамі па пяру падзяляліся брянскія паэты  пад кіраўніцтвам старшыні Брянскага абласнога аддзялення Саюзу пісьменнікаў Расіі Уладзіміра Сарочкіна. Свае вершы чыталі і прадстаўнікі Кобрыншчыны пад кіраўніцтвам Наталлі Ефціфеевай (Кандрашук). Гучалі паэтычныя творы на рускай, беларускай і ўкраінскай мовах. Сустрэча стала першай ластаўкай даўгачаснага сяброўства.

*(ЛіМ. – 2021. – 16 красавіка. – С. 2; Культура. – 2021. – 17 красавіка. – С. 10; Кобрин-информ. – 2021. – 22 апреля. – С. 6).*

ЦБ, 23 чал.

**9 красавіка**

У бібліятэцы прайшла духоўна-асветніцкая гадзіна «Ефросиния Полоцкая: учитель, воспитатель, библиотекарь», прысвечаная Дню памяці Еўфрасінні Полацкай. Дзецям прадэманстраваны відэафільм пра жыццё і дзейнасць князёўны «Ефросиния Полоцкая – святая и просветительница земли белорусской». Праведзена віктарына «Что я знаю о Ефросинии Полоцкой». Бібліятэкар правяла агляд выставы «Книги веры и добра». Ігумен царквы Ўшэсця Госпадня аг. Гарадзец айцец Георгій падарыў бібліятэцы кнігу «Брестская епархия: история и современность». У завяршэнні свята кожны ўзяў дахаты кнігу з выставы «Праваслаўная дзіцячая кніга».

Гарадзецкі філіял, 28 чал.

**13 красавіка**

Сустрэча паэтаў і празаікаў з настаўнікамі-філолагамі Кобрыншчыны адбылася ў фармаце літаратурнага скрыжавання «Брэст – Жабінка – Кобрын» у бібліятэцы. Перад прысутнымі сваю творчасць прадставілі старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Таццяна Дземідовіч з Брэста, яго член Анатоль Бензерук з Жабінкі і члены літарутурнага клуба “ПаэтыКо” Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Наталля Кандрашук і іншыя. Завяршылася мерапрыемства чаяваннем літаратараў, да якіх далучыўся яшчэ адзін член брэсцкай пісьменніцкай суполкі Вячаслаў Бурдыка.

*(Кобрин-информ. – 2021. – 22 апреля. – С. 6).*

ЦБ, 45 чал.

**13 красавіка**

Прайшоў урок памяці «Жизнь и смерть за оградой концлагеря», прысвечаны Міжнароднаму дню вызвалення вязняў канцлагераў. Гасцямі мерапрыемства сталі навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Супрацоўнікі бібліятэкі распавялі пра канцлагеры, якія атрымалі асаблівую сумную вядомасць: Азарычы, Асвенцым, Трасцянец, Дахау, Саласпілс, Бухенвальд, Майданэк, аб злачынствах фашыстаў у канцлагерах, аб злачынствах супраць дзяцей. Завяршылася мерапрыемства патрыятычнай песняй «Родина» ў выкананні бібліятэкара Наталлі Раманюк.

ЦБ, 26 чал.

**14 красавіка**

На базе ПЦПІ бібліятэкі з навучэнцамі Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа праведзена інтэлектуальна-прававая гульня «Прававы эрудыт». Госцем і непасрэдным удзельнікам мерапрыемства стала намеснік старшыні суда Кобрынскага раёна Таццяна Аляксандраўна Коберская. Навучэнцы разглядалі сітуацыйныя заданні, удзельнічалі ў конкурсах, будавалі нестандартныя сітуацыі, мульты-гумарыстычныя задачы, адказвалі на тэставыя заданні, прымалі ўдзел у віктарынах. Пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі, граматамі ад ПЦПІ кобрынскай бібліятэкі, якія былі ўручаны Т. А. Каберскай.

ЦБ, 41 чал.

**22 красавіка**

На базе бібліятэцы прайшоў адборачны тур Чэмпіянату па чытанню ўслых для дарослых на рускомве «Открой рот» 2020-2021. Удзельнікі без падрыхтоўкі чыталі ўрыўкі з сучаснай рускай прозы, санеты Канстанціна Бальмонта, сучасную замежную прозу. Аўтарытэтнае журы ў складзе дырэктара Кобрынскага Палаца культуры Валянціны Кірылюк, загадчыка аддзела мастацкай творчасці Кобрынскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці Ірыны Макарэвіч, выкладчыка рускай мовы і літаратуры Надзеі Пракаповіч ацэньвала майстэрства удзельнікаў па двух крытэрыях: тэхніцы чытання і артыстызму. Усе ўдзельнікі атрымалі прызы ад партнёраў чэмпіянату. Пераможцу адборачнага тура Марыну Міхалюк чакае ўдзел у рэгіянальным паўфінале.

*(Кобрин-информ. – 2021. – 29 апреля. – С. 6)*

ЦБ, 18 чал.

**23 красавіка**

Гасцямі ўроку патрыятызму «И помнить страшно, и забыть нельзя» сталі вучні старэйшых класаў гімназіі. Падчас сустрэчы была раскрыта гісторыя стварэння канцэнтрацыйных лагераў, пералічаныя асноўныя з іх, прыведзены фатаграфіі паўсядзённага побыту, раскрыта антычалавечая сутнасць нацызму. Асаблівы акцэнт прэзентацыі зроблены на супраціве вязняў-паўстанцаў - савецкіх грамадзян у канцэнтрацыйных лагерах. Прагучаў музычны нумар «Родина» ў выкананні Наталлі Раманюк.

ЦБ, 15 чал.

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**5 сакавіка**

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавана інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне «Праз творчасць – да майстэрства», якое прысвечана 40-годдзю з часу заснавання ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійны ліцэй сферы абслугоўвання» і працягвае цыкл выданняў з серыі «Адукацыя на Кобрыншчыне».

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3-85-81